# Пытаньні нацыянальнай палітыкі.

*(З прамовы т. Гамарніка на XII зьезьдзе КП(б)Б).*

У галіне нацыянальнай палітыкі ў партыі заўсёды была і ёсьць выразная і ясная лінія, якая і цяпер ня мае патрэбы ні ў якіх папраўках. Таму, уласна кажучы, на гэтым зьезьдзе трэ' было-б толькі гаварыць аб практыцы правядзеньня гэтай лініі за мінулы год, аб дэфэктах гэтай практыкі і далейшых задачах. Але шэраг фактаў апошняга часу, якія сьведчаць аб росьце шавінізму ўсіх гатункаў, фактаў, якія сыгналізуюць тэндэнцыю ўхілаў ад лініі партыі ў нацпытаньні,—усё гэта прымушае нас хоць-бы ў самым сьціслым выглядзе зноў паставіць агульныя пытаньні нацпалітыкі і сканцэнтраваць увагу партыі на барацьбе з ухіламі ў нацыянальным пытаньні ўнутры партыі і на барацьбе з шавінізмам наогул.

«Нацыянальнае пытаньне ёсьць частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, частка пытаньня аб дыктатуры пралетарыяту. Пытаньне аб правох нацыі ёсьць не ізаляванае і самастойнае пытаньне, а частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, частка, якая падпарадкавана цэламу і патрабуе свайго разгляду пад кутом погляду цэлага»,—кажа Сталін. Значыць, нацыянальнае пытаньне ёсьць частка, падпарадкаваная цэламу—пралетарскай рэвалюцыі. Хто гэтага не разумее, той нічога не разумее ў пралетарскай рэвалюцыі, клясавай барацьбе і ў нацыянальным пытаньні. Асноўныя ўхілы ад ленінскае лініі выцякаюць ад неразуменьня гэтай формулы і тымі, хто лічыць нацыянальнае пытаньне ізаляваным, самастойным пытаньнем, і тымі, хто не разумее, што мы павінны самым уважлівым чынам ставіцца да нацыянальнага пытаньня, як да часткі пралетарскае рэвалюцыі, і што ад правільнага вырашэньня гэтай часткі залежыць вельмі многае для пасьпяховага вырашэньня цэлага, г. зн. пралетарскай рэвалюцыі.

Наша партыя заўсёды—і да рэвалюцыі, і ва ўмовах пралетарскай рэвалюцыі—кіруючы краінай пралетарскай дыктатуры, умела і ўмее падыходзіць правільна да нацпытаньня, цесна зьвязваючы яго, як частку, з агульнай справай пралетарскае рэвалюцыі. Уладзімер Ільліч у 1913 годзе пісаў Шаумяну па нацыянальным пытаньні:

«Няхай сунуцца зараз апартуністычныя (бундаўскія, ліквідатарскія, народніцкія) сволачы, няхай дадуць свой та-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы